Жывая традыцыя

ЗВЯЗАНЫЯ АДНОЙ МУЗАЙ

Незвычайны рукатворны падарунак землякам у гонар святкавання 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне рыхтуюць у Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці. Тут у адмысловай лабараторыі ткацтва робяць эксклюзіўны габелен з выявай... самой маці Беларусі.

Аўтар эскіза сімвалічнага габелена — кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Яўген Шунейка. Менавіта ён сумясціў у адной карціне і замалёўкі з мінулага, і адвечныя сімвалы, і элементы традыцыйнага арнаменту, і сучасныя краявіды.

Будучая «тканая акварэль» пакуль безназоўная, таму абвешчаны конкурс на лепшую назву габелена. Прапановы прымаюцца да 9 сакавіка на электронную паштовую скрыню onmcnt@tut.by з пазнакай «габелен» і ў сацыяльных сетках.

У цэнтры кампазіцыі, абрамленай традыцыйным арнаментам, мастак змясціў вобраз маці Беларусі, у ніжняй частцы габелена будуць знаходзіцца замалёўкі ваенных гадоў, у сярэдзіне — будні гараджан і сельскіх жыхароў, наверсе — пазнавальныя панарамы беларускіх гарадоў. Над стварэннем шматколернага палатна памерам 1,5 на 2 метры працуе родная сястра Яўгена Феліксавіча, метадыст абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, майстар габеленаў Алена Шунейка. Любоў да народнай творчасці ў іх сямейная — перайшла ў спадчыну ад бацькі, вядомага гродзенскага мастака-тэкстыльшчыка і даследчыка Фелікса Шунейкі.

Ужо на працягу амаль 40 гадоў Алена Шунейка працягвае бацькаву справу: натхнёна працуе за ўнікальным станком — вертыкальнымі кроснамі, якія не маюць аналагаў у краіне. Ды і сама тэхніка ткацкага рамяства, якой валодае гродзенская майстрыха, адзіная ў сваім родзе, бо працягвае традыцыі так званага падвойнага і пераборнага аднабаковага ткацтва («закладання»). Гэты элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны, дарэчы, восем гадоў таму папоўніў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. У творчай скарбонцы ткачыхі — шэраг арыгінальных сюжэтна-тэматычных габеленавых кампазіцый з выявамі помнікаў архітэктуры, рэлігійнымі, гістарычнымі сюжэтамі, у якіх традыцыйныя ўзоры ў прамым і пераносным сэнсе пераплеценыя з уласным аўтарскім стылем.

Алене Шунейка дапамагае ў рэалізацыі новай задумы калега і пераемніца ткацкага рамяства Юлія Барадзіна — малады метадыст прызнаецца, што загадзя прадчувае радасць і захапленне ад канчатковага выніку працы «ў чатыры рукі».

«Безумоўна, гэта вялікі і складаны творчы працэс, праца не аднаго дня і нават не аднаго месяца, — расказала «Звяздзе» **загадчык аддзела традыцыйнай культуры Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Вольга ШЛАВЯНЕЦ.** — Калі б над ім працаваў толькі адзін майстар, праект доўжыўся б каля года, але паколькі праца ідзе ў чатыры рукі, спадзяёмся, што вынік зможам прадставіць жыхарам і гасцям Гродна калі не ў маі, да Дня Перамогі, то напярэдадні Дня Незалежнасці 3 ліпеня. Пакуль яшчэ прапрацоўваецца пытанне, дзе будзе выстаўлены габелен — магчыма, у нас у цэнтры, а магчыма, ён будзе перададзены ў падарунак аднаму з музеяў».

Творчая група ўжо прадумала дэталі аб'ёмнай работы, падабрала патрэбныя колеры і літаральна днямі заклала першую нітку ў станок. Але будучая «тканая акварэль» пакуль безназоўная, таму абвешчаны конкурс на лепшую назву габелена. Прапановы прымаюцца да 9 сакавіка на электронную паштовую скрыню onmcnt@tut.by з пазнакай «габелен» і ў сацыяльных сетках. А сачыць за пакрокавым стварэннем рукатворнага цуду можна на афіцыйным сайце цэнтра http://gromc.by і ў сацыяльных сетках https://vk.com/metod.centr.grodno, https://www.instagram.com/grodno_omcnt.

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота Гродзенскага АМЦНТ.

Пантэон Айчыны

Тадэвуш Касцюшка (1746—1817)

Нацыянальны герой Амерыкі і Польшчы, ганаровы грамадзянін Францыі... «Касцюшка — гэта найшчырэйшы сын свабоды, якога я бачыў, і пры гэтым той свабоды, якая ўключае ўсіх, а не толькі кучку выбраных або багатых», — пісаў пра яго змагар за незалежнасць Амерыкі Томас Джэферсан. Сучаснікі называлі Тадэвуша Касцюшку «сябрам прыгнечаных, ворагам прыгнятальнікаў».

Жыццё Тадэвуша Касцюшкі якраз і сведчыць пра яго барацьбу з гістарычнай і сацыяльнай несправядлівасцю. Ён паходзіў са збяднелага шляхецкага роду Касцюшак, вядомага на Берасцейшчыне з XVI стагоддзя. Паводле тагачаснай традыцыі лічыў сябе літвінам, чым і ганарыўся.

З дзяцінства Тадэвуш праяўляў упарты і настойлівы характар. Ужо ў гады вучобы ў Варшаўскай рыцарскай школе (кадэцкім корпусе) ён прывучыўся да аскетызму і праявіў настойлівасць у вучобе. Любімым дэвізам юнака быў выраз: «У чым можам праявіць найвялікшую сілу? Перамагаць самога сябе». А яго любімым героем стаў антычны герой Тымалеон, які ўсталяваў у Сіракузах дэмакратычны лад. Свае веды Тадэвуш памнажаў у Францыі, праходзіў курсы інжынерных навук. Але на радзіме Тадэвуш не знайшоў сабе месца ў войску, а няшчаснае каханне да Людвікі Сасноўскай нарадзіла ў яго сэрцы горкае расчараванне. Нязнатнае паходжанне Касцюшкі паставіла крыж на яго ваеннай кар'еры і асабістым шчасці. І ў 1776 годзе Касцюшка без ніводнага рэкамендацыйнага ліста выправіўся ў тагачасную сталіцу Злучаных Штатаў Амерыкі — Філадэльфію.

На сустрэчы з Джорджам Вашынгтонам ён прама заявіў: «Хачу змагацца за незалежнасць амерыканцаў». Сем гадоў

Тадэвуш Касцюшка на пасадзе галоўнага інжынера служыў у амерыканскай арміі Поўначы, пад яго кіраўніцтвам была пабудавана абарончая сістэма Філадэльфіі. Але славу яму прынесла перамога над англійскім войскам каля гарадка Сарасота ў 1777 годзе. Умела ўзведзеныя Касцюшкам умацаванні дазволілі амерыканцам акружыць і прымусіць англічан да капітуляцыі. Гэта была першая перамога амерыканцаў у вайне за незалежнасць, што паспрыяла міжнароднаму прызнанню маладой дзяржавы з боку Францыі.

У 1781 годзе пад кіраўніцтвам Касцюшкі вялася аблога крэпасці Найці Сікс. З яе капітуляцыяй перавага ў вайне перайшла да амерыканцаў. Адзначаючы ўклад Касцюшкі ў перамогу ў вайне за незалежнасць, Кангрэс надаў яму амерыканскае грамадзянства, званне брыгаднага генерала і пажыццёвую пенсію. А самую дарагую ўзнагароду — ордэн Цынцыната — Тадэвуш прысвяціў маці і павесіў перад абразом, перад якім яна малілася ва ўніяцкай царкве ў Даўгалісках.

Касцюшка вярнуўся на радзіму ў 1784 годзе, пасяліўся ў маёнтку Сяхновічы. Калі пачалася вайна супраць падзелу Рэчы Паспалітай, ніхто з ваенных кіраўнікоў не праявіў ні мужнасці, ні ўмельства, апроч Касцюшкі. У бітве каля вёскі Дубенка на Валыні 18 ліпеня 1792 года яго шасцітысячная брыгада гераічна білася з 20-тысячным войскам генерала Кахоўскага. Імя Тадэвуша Касцюшкі славай прагучала па ўсёй Рэчы Паспалітай.

Паражэнне ў вайне прыгнятальна падзейнічала на Касцюшку, ён падаў у адстаўку і эмігравaў у Лейпцыг. Аднак, калі рыхтавалася паўстанне супраць іншаземнага панавання, дык правадыром бачылі толькі Касцюшку. Ён згадзіўся ўзначаліць паўстанне, папярэдзіўшы: «Толькі за шляхту ваяваць не буду. Жадаю свабоды для ўсяго народа і толькі для яго гатовы ахвяраваць жыццё». Супраць «свабоды для ўсяго народа» выступіла Найвышэйшая нацыянальная рада на чале з магнацкай алігархіяй. Касцюшка стаў закладнікам гэтага заганнага становішча. Ён толькі змог у сваім Паланецкім універсале абвясціць сялянам асабістую вольнасць. Па сутнасці, сяляне не падтрымалі паўстанне, а без народнай сілы яно было асуджана на паражэнне. Тым не менш Касцюшка ўмела кіраваў абаронай Варшавы, адбіўшы ад яе рускія і прускія палкі. У рашучай бітве 10 кастрычніка 1794 года пад Мацяёвіцамі сямітысячнае паўстанцкае войска пацярпела паражэнне ад 14-тысячнага войска генерала Ферзена. У палон трапіў і паранены Касцюшка. Яго пад вартай адправілі ў Пецярбург. «Паранены ў галаву, знясілены, ён вытрымаў казематы Петрапалаўскай крэпасці. Аднак планы на Касцюшку ў палітычнай гульні супраць Аўстрыі і Прусіі вымагалі захаваць яму жыццё, аблегчыць няволю. Вызваліў Касцюшку ў 1796 годзе імператар Павел I. Касцюшка не прыняў расійскага грамадзянства і падарунка ў тысячу сялянскіх душ, а выехаў у Амерыку, якую ён лічыў сваёй другой айчынай.

Новыя надзеі Касцюшка звязваў з рэвалюцыйнай Францыяй. Менавіта паўстанне пад яго кіраўніцтвам выратавала Францыю ад вайны з Аўстрыяй і Прусіяй. Касцюшка гатовы быў узначаліць польскія легіёны ў французскай арміі пры ўмове іх прысязе «у нянавісці да каралёў і арыстакратыі, вернасці прынцыпам свабоды і роўнасці». Усё сталася не так. Рэвалюцыя нарадзіла ўзурпатара Напалеона, які хацеў выкарыстаць імя Касцюшкі ў сваіх заваёўніцкіх інтарэсах. Касцюшка адмовіўся служыць яму, як і ліберальнаму імператару Аляксандру I, які ў 1814 годзе дэкларавaў аднавіць Рэч Паспалітую. Касцюшка напісаў імператару: «Нарадзіўся я літвінам, найяснейшы пане, і няшмат гадоў жыцця мне застаецца, а завеса яшчэ пакрывае будучы лёс маёй роднай зямлі і шматлікіх яе ўскраін»...

Ушаноўваючы памяць Касцюшкі, прэзідэнт Амерыкі Уільям Гарысан сказаў у Кангрэсе: «Слава яго будзе жыць датуль, пакуль будзе панаваць над светам вольнасць; пакуль на алтар вольнасці яе абаронцы будуць класці ў ахвяру сваё жыццё, імя Касцюшкі будзе жыць сярод нас».

Вітаўт ЧАРОПКА.